Міронава Л.Б.,
ст.выкладчык

## УДАСКАНАЛЕННЕ МЕТОДЫКІ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРАКТЫЧНЫХ І СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ ПА ПРАДМЕТУ «ЗАМЕЖНАЯ ХАРАВАЯ ЛІТАРАТУРА»

Курс «Замежная харавая літаратура» ўваходзіць у лік прафілюючых дысцыплін па спецыялізацыі «хормайстар акадэмічнага хору». Асноўнымі мэтамі курса з'яўляюцца: пашырэнне музычнага кругагляду; авалоданне ведамі аб асноўных жанрах і стылях харавой музыкі; выхаванне навыкаў аналізу харавога твора, здольнасці да абагульнення і ўмення працаваць з музыказнаўчай літаратурай; развіццё прафесійных якасцей, неабходных для будучай музычна-харавой і педагагічнай дзейнасці; выпрацоўка мастацкага густу. Прадмет «Замежная харавая літаратура» абапіраецца на гісторыю музыкі, хоразнаўства і аналіз музычных твораў. Вывучэнне гэтага курса складаецца з двух асноўных накірункаў, тэарэтычнага і практычнага. Тэарэтычны ўключае лекцыі і самастойную работу над некаторымі тэмамі для больш абгрунтаванага вывучэння матэрыялу. Знаёмства з творчасцю замежных кампазітараў ажыццяўляецца на практычных і семінарскіх занятках.

У мэтах удасканалення навучальнага працэсу выкладчык можа на практычных занятках ажыццяўляць не толькі ілюстрацыю вывучаемага твора, а і выкананне яго ўсёй групай (хорам па партытуры). Такая форма зробіць заняткі больш цікавымі, разнастайнымі. Адначасова правяраюцца і навыкі хуткага чытання з ліста, і сальфеджыравання, і інтанацыі. Так у працэс практычных заняткаў уваходзіць новы прадмет «Харавы клас».

Важнейшай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце культуры з'яўляецца практыка студэнтаў, якая павінна быць накіравана на паглыбленне прафесійнай падрыхтоўкі, набыццё практычных навыкаў, неабходных у будучай прафесіі.

Можна прапанаваць лепшым студэнтам групы правесці заняткі ў якасці выкладчыкаў. Форму няхай выбіраюць самі, але абавязкова павінен быць уключаны тэарэтычны матэрыял (даклад) і практычны - разбор музычнага твора. Гэты разбор робіцца ў працэсе даклада-лекцыі. Але спачатку трэба выканаць твор на інструменце ці даць праслухаць у запісе. Пасля правядзення музычна-тэарэтычнага, вакальна-харавога аналізу вывучаемага твора, вызначыць музычна-выразныя сродкі, якія выкарыстоўвае кампазітар для раскрыцця зместу і галоўнай ідэі твора. Дарэчы, на гэтых занятках можна выконваць партытуры. Можна прапанаваць студэнтам зусім новую тэму, якая не чыталася выкладчыкам. Гэтая форма ўжо апрабіравана. Яна ўжываецца на занятках па «Замежнай харавой літаратуры» з мінулага года. Такая форма падабаецца студэнтам.

Ярохіна С.К.,
дацэнт

## ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ І НАВЫКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА «ХАРАВОЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЕ»

Сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне харавога мастацтва мае свае асаблівасці. Будучы хормайстр перад тым, як пачаць практычную работу з хорам, атрымлівае першапачатковую падрыхтоўку па дырыжыраванню ў форме індывідуальных заняткаў. Гэта дысцыпліна вывучаецца на працягу пяці гадоў, таму кожныя заняткі з'яўляюцца праверкай засваення студэнтам дакладных ведаў і навыкаў.

Аднак практыка правядзення індывідуальных заняткаў пераконвае ў недастатковасці ацэнкі работы студэнта адзін раз за цэлы год і дыктуе пошук шляхоў удасканалення педагагічнага кантролю за планамерным развіццём спецыяліста.

У якасці прагрэсіўнай формы актывізацыі сістэматычнай работы студэнтаў на працягу навучальнага года мы прапануем выкарыстоўваць кантрольныя заняткі або атэстацыю два разы ў год (лістапад, сакавік) у прысутнасці членаў метадычнай камісіі і куратараў. Такая форма справаздачы перад калектывам педагогаў дазваляе павысіць адказнасць студэнтаў, актывізаваць іх самастойную работу, своечасова выявіць недапрацоўкі, скарэкціраваць далейшае навучанне, што будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў.

Акрамя кантрольных заняткаў альбо атэстацыі, існуе сістэма завяршальнага кантролю ў кожным семестры ў выглядзе залікаў або экзаменаў як на дзённай, так і на завочнай форме навучання. Гэта своеасаблівае канцэртнае выступленне, якое ўключае гутарку па вывучанай праграме, ігру і спяванне галасоў харавой партытуры як па «гарызанталі», так і па «вертыкалі». Абавязкова напісанне анатацыі да партытур. Камісія ў складзе вядучых прафесараў і дацэнтаў кафедры ацэньвае ўзровень ведаў студэнтаў па ўсіх пералічаных напрамках.

Завяршаючым этапам праверкі ведаў і навыкаў студэнтаў з'яўляецца дзяржаўны экзамен, дзе студэнт дэманструе не толькі тэарэтычную, але і практычную падрыхтоўку па абранай ім спецыялізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ